# Гімн горада Фаніпаля

Словы Т. Кашчэва Музыка Т. Кашчэва

Энергічна, узвышана







1. Зусім непадалёку ад Мінска, між дарог,
Паселішчам узнік ён невялікім.
Прайшлі гады і спутнікам сталічным стаць ён змог,
Для нас -гасцінным горадам і блізкім.

Прыпеў: Расце і прыгажэе наш горад малады,
Наўкол дамы будуюць, красуюцца сады.
Гучыць дзіцячы смех і гоман.
Утульны родны Фаніпаль - наш гонар.

2. Гісторыя, легенды, імёны землякоў,
Іх моцны дух і лёс іх светлы, слынны
Жывуць у нашых сэрцах, як і ў памяці вякоў,
І ў летапісах велічнай Айчыны.

Прыпеў.

3. Краіну праслаўляе старанна з году ў год
Вучобай, плённай працаю руплівай.
Мінаюць хай стагоддзі - будзе ўдзячны наш народ
Спяваць заўжды пра горад свой любімы.

Прыпеў.